# Народныя песні. Каляндарна-абрадавыя песні

Урок беларускай літаратуры ў 6 класе

**С. У. Лабачэўская,**
настаўнік беларускай мовы і літаратуры
СШ № 3 г. Ашмяны,

**Мэта і задачы ўрока:** паглыбіць веды вучняў пра народную каляндарна-абрадавую паэзію; пашырыць уяўленне вучняў пра змест беларускіх народных песень, іх паэтыку і сродкі мастацкага выяўлення; далучыць вучняў да набыткаў айчыннай музычнай культуры і выяўленчага мастацтва, стварыць пэўны эмацыянальны настрой на ўроку, узбагаціць духоўны свет вучняў.

**Тып урока:** вывучэнне новага матэрыялу з выкарыстаннем міжпрадметных сувязей.

**Абсталяванне:** на дошцы — афарызмы пра песні; рэпрадукцыя карціны Віктара Барабанцава “На Купалле”; фотаздымкі беларускіх музычных калектываў; раздатачны матэрыял (карткі з заданнямі); мультымедыйная прэзентацыя “Каляндарна-абрадавыя песні”; мультымедыйная дошка; сэрвіс Learning Appsсайт (https://learningapps.org/); Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс (https://eior.by).

Эпіграф:

Песня народа —
гэта сапраўдная чалавечая душа.
*Рыгор Шырма,*
*беларускі дырыжор, кампазітар*

## Ход урока

I. Эмацыянальна-арганізацыйны этап.

*Уступнае слова настаўніка.*

- Паразважайце над эпіграфам урока.

*Інфармацыя пра беларускага кампазітара, дырыжора Рыгора Шырму.* Выступленне падрыхтаванага вучня.

*Вучань.*Рыгор Раманавіч Шырма (псеўданімы: Рыгор Баравы; Вучыцель). 1892-1978 гады жыцця. Беларускі харавы дырыжор, кампазітар, педагог, фалькларыст, грамадскі дзеяч, публіцыст, літаратуразнавец. Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР, лаўрэат Дзяржаўных прэмій БССР за канцэртна-выканаўчую дзейнасць і за «Беларускія народныя песні ў апрацоўках для хору», народны артыст БССР і СССР, заслужаны дзеяч мастацтваў БССР. Сабраў больш за 2 тысячы беларускіх народных песень.






**Беларускі харавы дырыжор, кампазітар, педагог, музыказнаўца-фалькларыст. Народны артыст СССР**

*Настаўнік.* У сваіх скарбах беларуская народная песня захавала шмат мудрасці, трывогі і радасці, святла і горычы, шчырай любові і праўды. Шмат пра песню гаварылі нашы продкі ў прыказках і прымаўках.

*Заданне ў парах. Злучыце часткі прыказак у адно цэлае. Растлумачце прыказкі* (Дадатак).

1.Без песні — хоць трэсні.

2.Дай мазі ў кола, а ў працы — песні вясёлай.

3.Калі не спявалі, то і не весяліліся.

4.На ўсё свае песні: на вяселлі вясельныя, а на хрысцінах — хрысцінныя.

5.Раз не было песень, то не было і вяселля.

6.Песня і ў радасці, і ў горы дапаможа.

Праверка: 1Г, 2Е, 3Б, 4А, 5В, 6Д.

II. Мэтавызначэнне ўрока.

*Настаўнік.* Сапраўды, у сваіх скарбах беларуская народная песня, як і ў прыказках, ды і ва ўсім фальклоры, захавала шмат мудрасці, трывогі і радасці, святла і горычы, шчырай любові і праўды. Мы сёння працягваем вывучаць тэму “Народныя песні” і паглыбім веды пра групы народных песень. Пазнаёмімся з народнымі песнямі, іх зместам, структурай.

III. Аперацыйна-пазнавальны этап.

*Работа па тэорыі літаратуры.*

**Мэта:** узнаўленне ведаў з мінулага ўрока “Народныя песні, іх групы і песні”.

1. Што называецца песняй?
2. На якія групы падзяляюцца народныя песні?
3. Растлумачце назву каляндарна-абрадавай групы песень. (Згодна каляндарнаму цыклу і народнаму святу).

*Індывідуальныя заданні на камп’ютары “Народныя песні”* (https://learningapps.org/13580555), “Беларускія народныя песні” (https://learningapps.org/2711551), “Народныя святы” (https://learningapps.org/21826469).

*Заданне. Па малюнку назавіце свята, від песні і каляндарны цыкл.* Запішыце наступную схему ў сшытку (схема на мультымедыйнай дошцы).

**Задача задання:** узнавіць веды па тэме “Народныя песні. Святы”, абагуліць веды.

| Свята | Від песні | Каляндарны цыкл |
|---|---|---|
| 1. | | |
| 2. | | |
| 3. | | |
| 4. | | |
| 5. | | |

Пасля адказаў вучняў выводзіцца слайд з правільнымі адказамі.



КАЛЯДЫ






МАСЛЕНІЦА





Гуканне вясны






Вялікдзень



КУПАЛЛЕ






Дадатковае заданне на ўзнаўленне атрыманых на папярэднім уроку ведаў. Назавіце 3 галоўныя асаблівасці (абрады) святкавання … (Каляд, Масленіцы, Гукання вясны, Вялікадня Купалля).

*Работа з народнымі песнямі.*

**Задачы задання:** удасканаліць уменні выразнага чытання; вызначыць змест і асаблівасці структуры песні, лексікі, ужывання мастацкіх сродкаў выразнасці. (На дошцы – ключавыя пытанні: Якая народная песня? Будова? Лексіка? Мастацкія сродкі выразнасці?)

*Выразнае чытанне народнай песні “Прыехала Каляда на белым кані…” (ля дошкі).*

*Абмеркаванне песні.*

1. Вызначэнне свята, віда песні, каляндарны цыкл. (Каляды, калядная песня – калядкі, зімовы цыкл.)
2. Хто такая Каляда? (Багіня зімовага сонца, а таксама дабрабыту і багацця.)
3. У якім вобразе паўстае Каляда? (Сталая добрая жанчына ў прыгожым кажушку на белым кані.)
4. Паразважайце, якімі рысамі чалавечага характару магла быць надзелена Каляда? (Добразычлівасцю, шчырасцю.)
5. Якімі сродкам выразнасці апісвае народ Каляду? (Параўнанне: “конічак – ясен месячык”, “дружачка – ясна зорачка”, “пужачка – ясна звёздачка”, “вазочак – тоўсты лядок”, “кажушок – белы сняжок”; адухаўленне – “прыехала Каляда”.)
6. У якой форме ўжыты назоўнікі ў песні? (У памяншальна-ласкальнай.) Чаму? (Ажыўляюць песню, надаюць меладычнасць, пяшчотнасць.)

*Індывідуальнае заданне на камп’ютары “Складзі калядку”* (https://learningapps.org/1295275).

Міжпрадметныя сувязі: літаратура і музыка.

**Мэта:** далучыць вучняў да набыткаў айчыннай музычнай культуры, сфарміраваць у вучняў навуковы светапогляд, стварыць пэўны эмацыянальны настрой на ўроку.

*Настаўнік.* Памятаем, што песня – гэта не толькі вершаваны твор, але і музычны. Многія народныя песні перапяваліся рознымі артыстамі, гуртамі, ансамблямі. Зразумела, гэта робіцца ў інструментальнай апрацоўцы, у сучаснай аранжыроўцы. Самы вядомы беларускі ансамбль, які спяваў і спявае народныя песні, – гэта ансамбль “Песняры”.

*Інфармацыя пра ансамбль “Песняры”.* Выступленне падрыхтаванага вучня.

*Вучань.* «Песняры» – беларускі вакальна-інструментальны ансамбль пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Уладзіміра Мулявіна (1941-2003).

Заснаваны ансамбль у Мінску ў 1969 годзе. Таму атрымаў славу яшчэ ў часы СССР. Самыя вядомыя песні – «Касіў Ясь канюшыну», «Белавежская пушча». У аснове стылю «Песняроў» ляжыць беларускі фальклор. Народныя песні і песні на вершы беларускіх паэтаў апрацоўваюцца інструментальна і на сучасны эстрадны стыль. Ансамбль атрымліваў шматлікія музычныя ўзнагароды. Састаў ансамбля неаднарозова змяняўся.

 

**«Песняры» - беларускі вакальна-інструментальны ансамбль пад кіраўніцтвам народнага артыста СССР Уладзіміра Мулявіна (1941-2003). Заснаваны ансамбль у Мінску ў 1969 годзе. Таму атрымаў славу яшчэ ў часы СССР. Самыя вядомыя песні – «Касіў Ясь канюшыну», «Белавежская пушча». У аснове стылю «Песняроў» ляжыць беларускі фальклор. Народныя песні і песні на вершы беларускіх паэтаў апрацоўваюцца інструментальна і на сучасны эстрадны стыль. Ансамбль атрымліваў шматлікія музычныя ўзнагароды. Састаў ансамбля неаднарозова змяняўся.**

*Праслухванне народнай песні "Каляда" ў выкананні беларускага ансамбля "Песняры" (1982г.) (https://www.youtube.com/watch?v=hRVqm3A5n7A).*

1. Падзяліцеся сваімі ўражаннямі ад праслуханай песні.
2. Якія цікавыя музычныя і інструментальныя моманты пачулі?
3. Ці перададзены святочны настрой у песні? Якімі сродкамі?

*Выразнае чытанне народнай песні "Благаславі, маці, вясну заклікаці…".(ля дошкі).*

*Абмеркаванне песні.*

1. У час якога свята спяваў народ такую песню? (Гуканне вясны.)
2. Як называюцца песні для свята Гуканне вясны? (Вяснянкі.)
3. На што спадзяецца народ, заклікаючы вясну? (На добры будучы ўраджай – "На буйнае жыта…".)
4. У якім вобразе ўвасоблена Вясна? (Маладая дзяўчына-прыгажуня.)

5. Якія выяўленчыя сродкі выразнасці дапамагаюць стварыць вобраз вясны? (Эпітэты: “вясна-краса”, “буйнае жыта”; метафары: “адамкнуць зямліцу”, “выпусціць травіцу”, памяншальна-ласкальныя словы: зямліца, травіца.)

6. Для народных песень характэрны паўторы. Паспрабуйце прачытаць песню, апусціўшы паўторы. Што змянілася ў творы? Як думаеце, якая мэта ўжывання такога прыёму? (Надання меладычнасці, мілагучнасці, узмацнення дзеяння.)

7. Якую яшчэ цікавую фанетычную асаблівасць вы заўважылі ў песні? (Гук “У-у-у”.) Як вы разумееце гэту асаблівасць? (Узмацненне закліку вясны.)

<u>Міжпрадметныя сувязі: літаратура і музыка.</u>

1. Якой вы ўяўляеце мелодыю для такой песні-вяснянкі?

2. Давайце праверым вашы “прадказанні”.

*Праслухванне народнай песні “Благаславі, маці, вясну заклікаці…” ў выкананні маладога беларускага гурта “Бан-Жвірба”* (*https://www.youtube.com/watch?v=UIA2WSvovwc*).

*Інфармацыя пра гурт «Бан-Жвірба». Выступленне папярэдне падрыхтаванага вучня.*

*Вучань.* «Бан-Жвірба” – заснаваны ў 1999 годзе ў Гомелі беларускі музычны гурт этна-року. Аснова песень – народныя песні з уплывам сучаснай альтэрнатыўнай (вольнай, нястрогай) музыкі.



**«Бан-Жвірба» — беларускі музычны гурт этна-року з Гомелю, заснаваны ў 1999. Аснова песень – народныя песні з уплывам сучаснай альтэрнатыўнай (вольнай, нястрогай) музыкі.**

1. У чым, на вашу думку, альтэрнатыўнасць, незвычайнасць такога выканання песні?

Міжпрадметныя сувязі: літаратура і музыка.

*Праслухванне народнай песні-вяснянкі ў традыцыйным ансамблевым выкананні* (https://www.youtube.com/watch?v=T_zJNeqpWsw).

1. Які варыянт вам больш даспадобы? Чаму? У чыім выкананні (гурта ці ансамбля) перадаецца народнасць свята?

*Выразнае чытанне песні "А на Купалу рана сонца іграла…".(ля дошкі).*

*Абмеркаванне песні.*

1. Вызначэнне свята, віда песні, калындарны цыкл. (Купалле, купальская песня, летні цыкл.)

2. З якой мэтай выконвалася песня:

а) цікава правесці вольны час;

*б) засцерагчы ўраджай напярэдадні яго збору;*

в) знайсці суджанага.

Аргументуйце свой адказ радкамі з песні. ("На хлябы-ўраджаі..".)

3. Растлумачце выраз "сонца іграла". (Ярка свяціла, пераліваласяся.) Які гэта будзе мастацкі сродак? (Увасабленне.)

*Слова настаўніка.*Паводле народнага павер'я, Сонца ў купальскую раніцу едзе да Месяца на трох конях, танцуе на калясніцы, з якой сыплюцца промні і іскры. Калі глядзіш на сонца, то здаецца, яно пераліваецца, іграе.)

4. Якія яшчэ вобразы паўсталі з песні? (Купала-гаспадыня, прырода, дзяўчаты.)

Міжпрадметныя сувязі: літаратура і жывапіс.

**Мэта:** далучыць вучняў да набыткаў айчыннага выяўленчага мастацтва, сфарміраваць у вучняў навуковы светапогляд, стварыць пэўны эмацыянальны настрой на ўроку.

Знаёмства з рэпрадукцыяй карціны Віктара Барабанцава "На Купалле".



***Віктар Барабанцаў.*** На Купалле

*Абмеркаванне рэпрадукцыі карціны.*

- Апішыце карціну: на пярэднім плане, на заднім плане, цэнтральнае месца;

- На якія традыцыі святкавання Купалля звяртае ўвагу жывапісец?

- Якім настроем прасякнута карціна? Якія вобразы і дэталі дапамагаюць ствараць такое настраёвае ўражанне?

- Што "чытаецца" на тварах моладзі?

- Якую колеравую палітру выкарыстоўвае мастак? Чаму такія фарбы?

- Ці атрымалася жывапісцу поўнасцю перадаць абраддавасць святкавання Купалля?

- Якую б вы як мастакі далі ацэнку гэтаму сюжэту і мастацкаму выражэнню?

IV. Кантрольна-ацэначны этап.

**Задача задання.** Праверка атрыманых ведаў па тэме "Народныя песні. Каляндарна-абрадавыя песні": іх змест, структура, мастацкае выяўленне.

*Самастойная тэставая работа* (з выкарыстаннем Адзінага інфармацыйна-адукацыйнага рэсурсу *https://eior.by/catalog_lecture/6-klass/bellit/16.php*, *https://eior.by/catalog_lecture/6-klass/bellit/17.php*).

1. Што такое песня?

○ вершаваны твор для выканання голасам;

○ невялікі па аб`ёме твор, напісаны вершаванай мовай;

◉ вершаваны і музычны твор для выканання голасам (спяванне);

○ трапнае народнае выслоўе, часцей з павучальным зместам, якое дае вобразную ацэнку чалавечым паводзінам, учынкам, якасцям.

2. Беларуская народная песня – гэта…

○ песня, створаная чалавекам у званні народнага паэта Беларусі;

○ песня, якая вылілася з сэрца і вуснаў усяго беларускага народа і перадавалася з пакалення ў пакаленне;

○ песня, якая стала вельмі папулярнай і яе ведаюць усе людзі нашай краіны.

3. На якія віды падзяляюцца абрадавыя песні?

☐ каляндарна-абрадавыя;

☐ літаратурныя;

☐ сямейна-абрадавыя;

☐ пазаабрадавыя.

4. Калі святкуюць Каляды?

○ з 25 снежня па 07 студзеня;

○ з 24 снежня па 06 студзеня;

○ з 31 снежня па 19 студзеня;

○ з 24 снежня па 14 студзеня.

5. Які вядомы беларускі ансамбль выконвае песню "Вы, калядачкі, бліны-ладачкі..."?

○ "Сябры";

○ "Зорачка";

◉ "Песняры";

○ "Палац".

6. Песню "Благаслаўі, маці, вясну заклікаці..." выконвалі падчас абраду:

◉ Гукання вясны;

- ○ Купалля;
- ○ Каляд;
- ○ вяселля.

7. Песня "Благаславі, маці, вясну заклікаці..." выконвалася з мэтай:

- ○ цікава правесці вольны час;
- ○ засцерагчы ўраджай напярэдадні збору;
- ◉ наблізіць вясну;
- ○ знайсці суджанага.

8. Песню "А на Купалу рана сонца іграла..." выконвалі падчас:

- ○ Гукання вясны;
- ○ Купалля;
- ○ Каляд;
- ○ вяселля.

9. Песня "А на Купалу рана сонца іграла..." выконвалася з мэтай:

- ○ цікава правесці вольны час;
- ◉ засцерагчы ўраджай напярэдадні збору;
- ○ прыблізіць вясну;
- ○ знайсці суджанага.

10. У песні "А на Купалу рана сонца іграла..." сустракаюцца наступныя вобразныя сродкі:

- ☐ эпітэт;
- ☐ метафара;
- ☐ памяншальна-ласкальныя словы;
- ☐ паўторы.

Здача тэставых работ настаўніку.

Адказы: 1) 3; 2) 2; 3) 1,3,4; 4) 2; 5) 3; 6) 1; 7) 3; 8) 2; 9) 2; 10) 1,2,4.

V. Рэфлексійна-ацэначны этап.

*Падагульняючае слова настаўніка.* Няхай сустрэча з народнай песняй абавязкова выклікае ў вас любоў да ўсёй народнай спадчыны і пакіне след у вашай душы.

Выстаўленне і каменціраванне адзнак.

VI. Дамашняе заданне.

Рознаўзроўневыя заданні.

1 узровень. С.72-74, выразнае чытанне песень, адказаць на пытанні.

2 узровень. Паведамленні "Народныя традыцыі святкавання вяселля і хрэсьбін".

3 узровень. Вуснае выказванне "Беларускія народныя песні – гэта скарбонка мудрасці, трывогі, радасці, святла і горычы, шчырай любові і праўды" (на аснове прачытаных песень).

**Дадатак. Раздатачны матэрыял.**

*Заданне. Суаднесці часткі прыказкі ў адно цэлае.*

| | |
|---|---|
| 1. Без песні — | А. на вяселлі вясельныя, а на хрысцінах – хрысцінныя. |
| 2. Дай мазі ў кола, | Б. то і не весяліліся. |
| 3. Калі не спявалі, | В. то не было і вяселля. |
| 4. На ўсё свае песні: | Г. хоць трэсні. |
| 5. Раз не было песень, | Д. і ў горы дапаможа. |
| 6. Песня і ў радасці, | Е. а ў працы — песні вясёлай. |

Адказ: ______________________________________________________